**УДК 75:7.071**

# Мастачка Валянціна Ляховіч: у руху да новых творчых даляглядаў

***Цыбульскі М.Л.***
*Установа адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава", Віцебск*

*У гэтым годзе мастачка і педагог Валянціна Ляховіч адзначыла свой чарговы юбілей. Як заўжды без усялякай помпы і ўрачыстасцей, занятая падрыхтоўкай да чарговага мастацкага праекта і стварэннем новых кампазіцый. Артыкул прысвечаны аналізу творчасці гэтай вядомай беларускай мастачкі, этапам і асаблівасцям эвалюцыі яе творчасці, педагагічнай дзейнасці, стылістыцы і мове мастацкіх твораў.*

*Пра Валянціну Ляховіч у мастацкім асяроддзі рэспублікі здаецца ўжо даўно перасталі казаць як толькі пра выдатную і таленавітую акварэлістку. Мастачка ў апошняе дзесяцігоддзе зарэкамендавала сябе і як майстар манументальных, вялікіх па памерах жывапісных твораў, і як аўтар своеасаблівых і эфектных мастацкіх аб'ектаў.*

*Акварэль у чыстым выглядзе ці ў змешаных тэхніках на ўсіх этапах творчасці В. Ляховіч застаецца адным з улюбёных матэрыялаў. На працягу амаль двух дзесяцігоддзяў у работах мастачкі дамінуе рэалістычны накірунак, яна ў вялікай колькасці піша партрэты, пейзажы, нацюрморты, што вылучаюцца віртуознасцю выканання і высокім прафесійным майстэрствам. У другой палове 1980-х Валянціна Ляховіч усё часцей аддае перавагу асацыятыўна-вобразнай абстракцыі. Мастачка прапануе свой шлях ад выявы, яе элементаў да мастацкага вобраза. У кожнай канкрэтнай кампазіцыі творца імкнецца да адметнай формапластычнай канцэпцыі.*

*Аб'екты В. Ляховіч уяўляюць сабой арганічны сінтэз канцэпцыі вобраза і складанага каларыстычна і пластычна вырашанага аб'ёма. Серыйнасць творчасці прыводзіць мастачку да неабходнасці выкарыстання выставы-праекта як адзінага і цэласнага мастацкага выказвання. Значная роля ў праектах належыць не толькі асобным творам, але і экспазіцыі ў цэлым. Большасць з праектаў Ляховіч злучана з уласнай біяграфіяй мастачкі, так ці інакш закранае сюжэты з яе жыцця, успаміны пра родных і сяброў, разважанні.*

***Ключавыя словы:*** *Валянціна Ляховіч, Віцебскі дзяржаўны педагагічны інстытут, мастацка-графічны факультэт, жывапіс, калаж, віцебская акварэль, вобраз, формапластычны эксперымент, рэалістычны накірунак, абстракцыя, канцэпцыя, аб'ект, "трэш-культура", мастацкі праект, экспазіцыя.*

*(Искусство и культура. – 2025. – № 2(58). – С. 5–11)*

# Artist Valentsyna Lyahovich: on the Move to New Creative Perspectives

***Tsybulsky M.L.***
*Education Establishment "Vitebsk State P.M. Masherov University", Vitebsk*

*This year, the artist and teacher Valentina Lyakhovich celebrated another anniversary. As always, without any pomp and ceremony, busy preparing another artistic project and creating new compositions. The article is devoted to the analysis of the work of this famous Belarusian artist, the stages and features of the evolution of her work, pedagogical activity, style and language of artistic works.*

*It seems that Valentina Lyakhovich in the artistic environment of the republic has long ceased to be talked about only as an excellent and talented watercolorist. In the last decade, the artist has established herself as a master of monumental, large-scale paintings, and as the author of original and spectacular artistic objects.*

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail: mtsybulsky@rambler.ru – М.Л. Цыбульскі*

*Watercolor in its pure form, or in mixed techniques, at all stages of V. Lyakhovich's work, remains one of her favorite materials. For almost two decades, the artist's works have been dominated by a realistic direction; she has painted a large number of portraits, landscapes, and still lifes, distinguished by virtuosity of execution and high professional skill. In the second half of the 1980s, Valentina Lyakhovich increasingly preferred associative-figurative abstraction. The artist offers her own path from the image, its elements to the artistic image. In each specific composition, the artist strives for a distinctive form-plastic concept.*

*V. Lyakhovich's objects represent an organic synthesis of the concept of the image and a complex coloristic and plastically resolved volume. The seriality of creativity leads the artist to the necessity of using the exhibition-project as a single and integral artistic expression. A significant role in the projects belongs not only to individual works, but also to the exposition as a whole. Most of Lyakhovich's projects are connected with the artist's own biography, in one way or another touching on plots from her life, memories of family and friends, reflections.*

***Key words:*** *Valentina Lyakhovich, Vitebsk State Pedagogical Institute, Faculty of Art and Graphics, painting, collage, Vitebsk watercolor, image, form-plastic experiment, realistic direction, abstraction, concept, object, "trash culture", art project, exhibition.*

*(Art and Cultur. – 2025. – № 2(58). – P. 5–11)*

Валянціна Ляховіч… Яе шлях у мастацтве вызначаны нястомнай працай і пошукам, жаданнем эксперыментаваць, ствараць нешта зусім новае. Яе творчае крэда – пазнанне, накіраванасць на мастацкае асэнсаванне свету і, канешне ж, сябе. Творчыя пазіцыі В. Ляховіч дастаткова выразна акрэсленыя, пазбаўленыя мудрагелістай філасафічнасці і эпатажнай вычварнасці, далёкія ад простай знешняй эфектнасці ці банальнай дэманстрацыі ўзроўню прафесійнага майстэрства. Шчырасць творчасці Валянціны Ляховіч і своеасаблівасць яе мастацкага мыслення найбольш яскрава выражаюцца ў яе творах – жывапісных імправізацыях і пластычных эксперыментах з аб'ёмам, якія нібыта надзеленыя магічнай энергіяй прыцягваюць гледача. Калісьці ў друку Валянціну Ляховіч назвалі "бескампраміснай прыхільніцай жыцця мастацтвам". І ў гэтым няма вялікага перабольшвання.

Мэта – прааналізаваць творчасць вядомай беларускай мастачкі Валянціны Ляховіч, выявіць этапы і асаблівасці эвалюцыі яе творчага шляху і педагагічнай дзейнасці, стылістыку і мову мастацкіх твораў.

**Мары дзяцінства.** Валянціна Ляховіч нарадзілася 3 мая 1945 года на станцыі Дзівенская Гатчынскага раёна Ленінградскай вобласці [1]. У 1948 годзе сям'я пераехала ў Віцебск, дзе жыла бацькоўская радня. У дзяцінстве Валянціна любіла маляваць, шмат капіравала прыгожыя каляровыя этыкеткі з яблыкамі, вінаградам, апельсінамі, якія прыносіў бацька. У час вучобы ў школе ёй падабалася перамалёўваць розныя рэпрадукцыі. "Калі бацькі купілі мне першыя акварэльныя фарбы "Нева", – узгадвае В. Ляховіч, – я іх нават пад падушку з сабой спаць клала"[1].

Мара стаць мастаком нарадзілася мабыць пасля аднаго з назіранняў за працай студэнтаў мастацка-графічнага факультэта, якія малявалі эцюды на беразе ракі Лучосы. Людзі, якія ўмеюць маляваць, здаваліся Валянціне Ляховіч незвычайнымі [2]. Пазней Валянціна займалася ў гуртку выяўленчага мастацтва пры Доме піянераў і ў студыі пры пядінстытуце. "Пра апошнюю, якую вёў Дзмітрый Паўлавіч Генеральніцкі, я даведалася ад майго старэйшага сябра Валянціна, які працаваў мастаком у кінатэатры ў Лучосе. Разам з іншымі дарослымі самадзейнымі мастакамі я хадзіла ў гэту студыю, што знаходзілася ў будынку мастацка-графічнага факультэта на вуліцы Чэхава"[2]. Студыя стала для дзяўчыны першай сур'ёзнай школай засваення мастацкага рамяства. А сам Генеральніцкі прыкладам адданасці мастацтву: "ён жыў гэтым і працаваў разам з намі"[3].

У агульнаадукацыйнай школе № 43, дзе вучылася Валянціна Ляховіч, яе творчыя захапленні падтрымлівалі. "Наш настаўнік матэматыкі Самуіл Уладзіміравіч Беленькі аднойчы нават прапанаваў паехаць з ім у турыстычна-спартыўны лагер. Але не як спартсменцы, а як юнай мастачцы. Там я сустрэлася з яшчэ адным вельмі цікавым чалавекам, для якога мастацтва было часткай яго жыцця, – дырэктарам школы № 3 Міхаілам Мацвеевічам Жураўковым. Даведаўшыся пра маю любоў да малявання, ён прапанаваў мне – дзяўчынцы – разам пісаць эцюды. Мы падымаліся ў 4–5 гадзін раніцы і ішлі на возера. Садзіліся ў лодку, адплывалі ад берага. Перад намі адкрывалася такая прыгажосць... "[4].

**Мастацка-графічны факультэт.** Пасля заканчэння школы В. Ляховіч вырашыла паступаць на мастацка-графічны факультэт Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута. "Так здарылася, што я паступала на факультэт два

[1] З успамінаў В. Ляховіч. Запіс перадачы "Время АРТ" ТРК "Віцебск" ад 02.05.2020.

[2] Інтэрв'ю з В. Ляховіч. Запіс 11.05.2025. Архіў М. Цыбульскага.

[3] З успамінаў В. Ляховіч. Запіс перадачы "Время АРТ" ТРК "Віцебск" ад 02.05.2020.

[4] Інтэрв'ю з В. Ляховіч. Запіс 11.05.2025. Архіў М. Цыбульскага.

разы. Першы раз мне паставілі тройку па малюнку. Нацюрморт сапраўды быў складаны, але прычына такой нізкай адзнакі была, як я зразумела пазней, не ў гэтым. Так ці інакш у мяне было жудаснае засмучэнне. Я моцна перажывала, таму што вельмі хацела вучыцца. Блукала ўначы па горадзе... І нейкі час нават маляваць да свайго любімага настаўніка Генеральніцкага не хадзіла...”[5].

На мастацка-графічным факультэце Валянціна Ляховіч першапачаткова вучылася ў вядомага віцебскага мастака Івана Сталярова. Захапілася акварэльным жывапісам, засвоіла многія тэхнікі пісьма. “Сталяроў даў паняцце класічнай акварэлі, прывіў строгае стаўленне да натуры, да вывучэння тэхнікі” [3]. “Іван Міхайлавіч мяне хваліў за тое, што я вельмі дакладна перадавала колер, яго адценні. Аднойчы ён нават узяў мяне з сабой на студыю тэлебачання разам з маімі акварэльнымі работамі і работамі іншых студэнтаў…”[6].

Важную ролю ў спасціжэнні В. Ляховіч асноў мастацтва і творчасці адыграў Фелікс Гумен. “Я не вучылася ў Ф. Гумена і толькі аднойчы ў час студэнцтва была разам з ім на пленэры. Аднак знаёмства з творчасцю гэтага мастака, манерай яго жывапісу моцна паўплывала на мяне. Можна ўвогуле сказаць, што на факультэце папулярнасць акварэлі пайшла ад Гумена”[7]. Сапраўды Фелікс Гумен прынёс у акварэль экспрэсію, дынаміку, раскаванасць. Яго манера была зусім не падобнай на тое, што рабілі іншыя акварэлісты. Многія мастакі, у тым ліку і Валянціна Ляховіч, актыўна пераймаюць акварэльныя прыёмы Гумена. Пад уплывам яго творчасці студэнтка пачала эксперыментаваць.

Творчая дзейнасць пачалася ўжо на другім курсе. Валянціне Ляховіч нават удалося трапіць са сваёй акварэльнай работай на рэспубліканскую маладзёжную мастацкую выставу. У той час падобная магчымасць была пераважна ў выпускнікоў мастацкіх устаноў і прафесійных мастакоў. “Добра памятаю, што на гэту выставу быў адабраны пейзаж, напісаны мною ў раёне фабрыкі «КІМ». Гэты твор нават потым надрукавалі ў газеце”[8].

Вучоба ў інстытуце Валянціне Ляховіч падабалася. “Я любіла жывапіс і малюнак. Але не толькі. Мяне вельмі цікавіла гісторыя мастацтва, паколькі ўжо ў той час я разумела, што веданне гісторыі мастацтва надзвычай важнае для мастака. Вялікую ролю ў перыяд навучання для нас – студэнтаў мела наведванне выстаў”[9].

Перад выхадам на дыплом, па словах В. Ляховіч, яна ўжо цалкам была пад уплывам творчасці Ф. Гумена. “Гэта не дзіўна. Калі назіраеш за тым, як Гумен піша, хочацца гэта рабіць так, як ён. І дыпломную работу я хацела выконваць пад яго кіраўніцтвам. Але загадчык кафедры сказаў мне, што мяне бярэ І. Сталяроў. Спрачацца з гэтым я не магла. Тэма дыпломнай работы была зацверджана – «Наваполацк – горад вялікай хіміі». Я ездзіла ў Наваполацк, пісала эцюды, працавала над кампазіцыямі. Канешне ж, тэхніка пісьма была даволі эксперыментальная, я выкарыстоўвала змывы, зрывы фарбы, умоўнасці... Калі практычна ўсё было зроблена і трэба было атрымліваць допуск да абароны, я даведалася, што Сталяроў адмаўляецца мяне браць. Плячо падставіў Ф. Гумен”[10].

Абарона дыпломнай работы прайшла паспяхова. Рэцэнзент, якім быў вядомы беларускі акварэліст Г.Ф. Шутаў, адзначаў майстэрскае валоданне акварэльнай тэхнікай, умелае выкарыстанне колеравых суадносін. Прапануючы выдатную адзнаку за дыпломную работу В. Ляховіч, ён пісаў: “З пункту гледжання кампазіцыйнай пабудовы кожны аркуш задуманы цікава і цалкам уся серыя ўяўляе сабой адзіны гарманічны твор (...) Валянціна Ляховіч – сапраўдны майстар акварэлі”[11].

Пасля заканчэння інстытута ў 1969 годзе В. Ляховіч пяць гадоў працавала ў Віцебскіх мастацка-вытворчых майстэрнях. “Праца на мастацкім камбінаце – гэта было не мае. Я ніколі не любіла пісаць шрыфты, а там такой працы было вельмі многа. Але ж я прызнавала мастацтвам толькі жывапіс. Усё астатняе лічыла звычайнай халтурай”[12]. Менавіта таму акварэльная творчасць у В. Ляховіч у гэты перыяд была на першым месцы. Гэты час адметны яе прыхільнасцю да працы ў галіне рэалістычнага жывапісу, прынёс ёй славу высокапрафесійнага майстра акварэлі. Але, як адзначае сама мастачка, “ён не мог адказаць на пытанні, якія паўсталі перада мной...”[3]. “Гэта быў «натуралістычны» перыяд у маёй творчасці. І я ўсё больш пачынала адчуваць, што гэта не маё. Я хачу рабіць інакш, па-свойму…”[13].

**Выкладчыцкая праца.** Асноўную частку свайго жыцця (больш за 25 гадоў) Валянціна

[5] Інтэрв’ю з В. Ляховіч. Запіс 11.05.2025. Архіў М. Цыбульскага.
[6] Тамсама.
[7] З інтэрв’ю В. Ляховіч. Запіс 2005. г. Архіў М. Цыбульскага.
[8] Інтэрв’ю з В. Ляховіч. Запіс 13.05.2025. Архіў М.Цыбульскага.
[9] З інтэрв’ю В. Ляховіч. Запіс 2005 г. Архіў М. Цыбульскага.
[10] Інтэрв’ю з В. Ляховіч. Запіс 11.05.2025. Архіў М. Цыбульскага.
[11] З рэцэнзіі на дыпломную работу студэнткі. Рэцэнзент Г.Ф. Шутаў. 28 мая 1969 г. Архіў М. Цыбульскага.
[12] Інтэрв’ю з В. Ляховіч. Запіс 13.05.2025. Архіў М. Цыбульскага.
[13] З інтэрв’ю В. Ляховіч. Запіс 2005 г. Архіў М. Цыбульскага.

Ляховіч выкладала на кафедры выяўленчага мастацтва ВДПІ. “Мяне запрасілі ў інстытут пасля таго, як я прадставіла на адной з выстаў серыю даволі вялікіх па памерах і вельмі ўдалых партрэтаў з натуры”[14].

Пра працу на мастацка-графічным факультэце ў самой В. Ляховіч спрэчныя ўспаміны. Адно яна падкрэслівае заўжды: “Я любіла працаваць са студэнтамі. І мне здаецца, яны любілі мяне. На гурток па акварэлі прыходзіла многа студэнтаў. Яны ведалі як мяне «завесці». Уцягвалі ў размову – і я гадзіну ці дзве ім нешта расказвала пра мастацтва, пакуль у мяне не пачынаў садзіцца голас... Але ж я радавалася, калі бачыла ў вачах студэнтаў зацікаўленасць, жаданне займацца мастацтвам. А ўжо калі чалавек таленавіты, я гатова была распластацца і падтрымаць яго. Я магла да доктара не пайсці, але да студэнтаў на дадатковыя заняткі – абавязкова”[15].

Сістэма і метады працы са студэнтамі на занятках у Ляховіч былі выпрацаваны зыходзячы з уласнага асэнсавання ролі асобы ў мастацтве.“Я разумела, што нельга  навязваць студэнтам нейкую канкрэтную манеру, ламаць індывідуальнасць. Некаторыя мае калегі былі з’арыентаваны толькі на засваенне акварэльных прыёмаў. Але ж «голы» прыём нічога не варты, ён бессэнсоўны… Варта вучыць канструктыўна мысліць. Трэба выхоўваць пачуццё густу, колеру. Я ніколі не прытрымлівалася шаблонаў, стандартаў у методыцы навучання мастацтву, не навязвала сваё бачанне натуры, свае погляды. Мне хацелася, каб у работах маіх вучняў былі іх уласныя эмоцыі...”[16].

У перыяд працы выкладчыкам Валянціна Ляховіч шмат часу прысвячала самаадукацыі, чытала, наведвала музеі і выставы, аналізавала свае погляды на мастацтва і творчасць розных мастакоў. У кола зразумелых для яе творцаў далёка не адразу трапілі вядомыя прадстаўнікі авангарда, эксперыментатары. “Мастак, як і педагог, вучыцца ўсё жыццё. Час ідзе, нешта змяняецца і трэба пастаянна сваю кваліфікацыю павышаць”[17].

Да вучняў і асабліва тых, хто прыходзіў да яе ў гурток акварэлі, Валянціне Ляховіч больш за ўсё хацелася данесці ідэю, што “мастацтва – гэта заўжды цяжка. Я вельмі спадзявалася, што сапраўды зацікаўленыя студэнты павінны былі гэта зразумець”[18]. Пазней, абмяркоўваючы з мастацтвазнаўцай А. Ге ідэю выставы “Настаўнік і вучні”, “мастачка згадвала яе рабочую назву «Майстэрня», падкрэсліваючы той факт, што для самой В. Ляховіч гэта не «парад дасягненняў» і аўтарытарная пазіцыя настаўніка, а раўнапраўе любой творчасці” [4].

Некалькі гадоў пасля выкладання на кафедры ў інстытуце В. Ляховіч працавала выкладчыцай у Дзіцячай мастацкай школе г. Віцебска. “Мне здаецца, што са шмат якімі вучнямі я пасябравала і натхніла іх на творчасць. Я любіла выходзіць з дзецьмі на пленэр, дзе заўжды прымушала іх многа працаваць...”[19].

**Акварэль: шлях ад рэалістычнага вобраза да абстракцыі.** Акварэль у чыстым выглядзе ці ў змешаных тэхніках на ўсіх этапах творчасці В. Ляховіч заставалася адным з улюбёных матэрыялаў. У акварэлі жывапісец заўжды высока цаніла яе рухомасць, пластычнасць, каларыстычнае багацце, магчымасць эксперыментаваць.

На першым этапе творчасці мастачка шмат пісала з натуры. Партрэты, пейзажы, нацюрморты гэтага часу вылучаюцца віртуознасцю выканання і высокім прафесійным майстэрствам. Асаблівую ўвагу В. Ляховіч надавала працы з колерам, засваенню розных тэхнік акварэлі. У партрэтах мастачка ўважліва ставілася да перадачы характару, псіхалагічнага стану мадэлі. Творчая актыўнасць і высокі прафесіяналізм дазволілі В. Ляховіч у 1973 годзе стаць сябрам Саюза мастакоў СССР [1].

На працягу амаль двух дзесяцігоддзяў рэалістычны накірунак займае цэнтральнае месца ў творчасці В. Ляховіч. Яе кампазіцыі вылучаюцца арыгінальнасцю каларыстычных рашэнняў, паэтычным і лірычным характарам вобразаў. Нягледзячы на жыццёвую канкрэтыку і апавядальнасць гэтых работ, яны далёкія ад ілюстратыўнасці. Мастачка шукае квінтэсэнцыю эмацыянальна-выразнага вобраза, непаўторную асацыятыўнасць. Працы В. Ляховіч гэтага часу “сведчаць аб яе неардынарнай адоранасці і апантанасці мастацтвам акварэлі. Шматлікія партрэты і пейзажныя кампазіцыі мастачкі – яскравыя прыклады выразнай пластычнай манеры, глыбокіх прафесійных ведаў акварэльнай тэхнікі”[5].

Валянціна Ляховіч прымае ўдзел у шэрагу Усесаюзных выстаў акварэлі, рабоце Усесаюзнай творчай групы акварэлістаў. “Мне пашанцавала трапіць ва Усесаюзную групу і пабываць на працягу сарака дзён у розных гарадах. Асабліва ўразілі Свярдлоўск, Урал… Тая рэальнасць была нам незнаёмая. Доменныя печы, індустрыяльныя ландшафты захаплялі. Я пісала без падрыхтоўчага малюнка, самааддана працавала над партрэтамі

[14] Інтэрв’ю з В. Ляховіч. Запіс 11.05.2025. Архіў М. Цыбульскага.
[15] Інтэрв’ю з В. Ляховіч. Запіс 13.05.2025. Архіў М. Цыбульскага.
[16] Тамсама.
[17] З інтэрв’ю В. Ляховіч. Запіс 2005 г. Архіў М. Цыбульскага.
[18] Інтэрв’ю з В. Ляховіч. Запіс 11.05.2025. Архіў М. Цыбульскага.
[19] Інтэрв’ю з В. Ляховіч. Запіс 11.05.2025. Архіў М. Цыбульскага.

сталевараў. Знаёмства ў гэтай групе з мастакамі з Прыбалтыкі для майго самаразвіцця было вельмі каштоўным. У групе быў эстонскі графік Аляксандр Пілар, які не толькі шмат расказваў нам пра творчасць, але і дэманстраваў вольнае валоданне мастацкімі матэрыяламі”[20].

У творах пачатку 1980-х В. Ляховіч звычайна “не ілюструе думку, а стварае эмацыянальна-вобразную карціну быцця, у якой ёсць месца і прамому апавяданню, і хуткай асацыяцыі, і працягламу разважанню” [6]. Паступова ў творчасці мастачкі змяняецца функцыя колеру, які набывае сэнсаўтваральны характар. “Прайшоўшы цяжкі шлях пераадолення натуралізму колеру (для многіх непераадольны), Валянціна Ляховіч узбагаціла прыродны каларыстычны дар сапраўднаю музыкаю тонаў...” [7].

Але ж як прызнаецца сама мастачка: “У мяне такая натура: мне хутка надакучвае займацца адным і тым жа. Я шукаю... Я хачу, каб праца была падпарадкавана маёй ідэі”[21]. На чарговым этапе сваёй творчасці В. Ляховіч нібы адмаўляецца ад адлюстравання прасторы, сюжэтных матываў, выкарыстоўвае стылізацыю. На змену рамантычным пейзажам і рэалістычным партрэтам прыйшлі “кампазіцыі, якія дэманструюць глыбокую цікавасць аўтара да жывапіснай мовы, аналізу яе элементаў” [6].

У другой палове 1980-х Валянціна Ляховіч усё часцей аддае перавагу асацыятыўна-вобразнай абстракцыі. “Абстракцыя дала мне бязмежную свабоду ў творчасці”[22]. Акварэльныя аркушы мастачкі ўражваюць паліфанічнасцю вобразаў, складанымі спалучэннямі колераў, незвычайнымі трансфармацыямі і мігаценнем пластычных форм, шматграннасцю фактур. Пры гэтым В. Ляховіч не губляе і ўласцівыя ёй лірычны настрой, і рамантычную танальнасць вобразнага поля. У сваіх кампазіцыях яна стварае свой СВЕТ, адметны жывапіснасцю і своеасаблівай архітэктонікай. Усё часцей пошукі новай вобразнасці вядуць да ўжывання змешанай тэхнікі, калажа. Шматкроць распрацоўваючы той ці іншы матыў, В. Ляховіч заўжды імкнецца да лаканічнасці кампазіцыі, чысціні і свежасці жывапіснага ладу, нечаканай пабудовы вобразнасці.

Каларыстычныя імправізацыі мастачкі – гэта не проста гульня з матэрыялам, а свядомы пошук кампазіцыйнай структуры і колера-пластычнага рашэння твора. Мастачка ніколі прынцыпова не адмаўлялася ад вобразаў навакольнага свету. У шэрагу яе жывапісных кампазіцый немагчыма не заўважыць своеасаблівых праекцый, “ценяў” рэальных аб’ектаў. В. Ляховіч атрымлівае першапачатковы штуршок ад вобразнай сутнасці саміх рэчаў. Форма і колер аб’ектаў рэальнага асяроддзя задаюць жывапісную інтанацыю, уладзе якой мастачка цалкам падпарадкоўваецца і, трапяткова прытрымліваючыся яе, “імчыць” у прастору колеру. Пры гэтым рэальныя вобразы свету ператвараюцца, трансфармуюцца ў прасторы, распадаюцца і складаюцца зноў ужо на яе аркушах. В. Ляховіч адыходзіць ад ілюзіяністычнай вобразнасці, чым адразу разбурае традыцыйную схему ўспрыняцця твора гледачом, скіраваную на ідэнтыфікацыю рэчаў. Мастачка прапануе свой шлях ад выявы, яе элементаў да мастацкага вобраза. У кожнай канкрэтнай кампазіцыі В. Ляховіч імкнецца да адметнай формапластычнай канцэпцыі. “Яна не адвяргае рэальнасці і не фетышызуе абстрактнасць, а ўвасабляе адзінства роўнавялікіх пачаткаў, напаўняе свае пошукі моцным сплавам формы і зместу, глыбокаю інтуіцыяй разумеючы, што і аддаленая рэальнасць пакідае ў абстрактным свой магічны знак” [7].

У пачатку 2000-х даследчыкі творчасці В. Ляховіч адзначаюць: “Асаблівасць акварэляў Валянціны Ляховіч – у іх шматслойнасці, як вобразнай, так і тэхнічнай, якая надае ім палімпсестны характар. У іх, як у старажытных кодэксах, напісаных на ўжо былым ва ўжыванні пергаменце са слядамі папярэдніх тэкстаў, прысутнічае магія шматразовага да іх звароту, карпатлівага тварэння мастацкага вобраза...” [8]. Кожны новы твор Валянціны Ляховіч гэтага перыяду “яшчэ адно адкрыццё прасторы колеру і яго гармоніі. Прасторы бязмежнай і захапляльнай, неакрэсленай толькі палітрай простых чалавечых пачуццяў, патрабуючай канцэнтрацыі ўсёй духоўнай энергіі гледача” [5]. Гэта відавочна “ў мільгаценні цытат сусветнай культурнай спадчыны, твораў сучасных мастакоў, у аўтацытаванні ўласных твораў і міфалогіі, у разгортванні цыклаў-серый” [4]. Вобразы ў большасці яе акварэляў нібыта паўстаюць “з хаосу паўсядзённых спраў, інфармацыйнага патоку сучаснасці і магічнай цэнзуры бессвядомага Мастака-дэміурга [9]. Жывапіс В. Ляховіч – “гэта паэзія і музыка поглядаў, жэстаў, рухаў, дзеянняў, увасобленая ў колеры” [10].

Мова яе твораў, якая знешне здаецца стыхійнай і хаатычнай, на самай справе дасканала прадумана. Спалучэнне жывапіснай экпрэсіі, вытанчаных і гарманічных каларытаў, узмоцненае дзіўным і няўлоўным

[20] Інтэрв’ю з В. Ляховіч. Запіс 13.05.2025. Архіў М. Цыбульскага.
[21] З успамінаў В. Ляховіч. Запіс перадачы “Время АРТ” ТРК “Віцебск” ад 02.05.2020.
[22] Тамсама.

ззяннем жывапіснай фактуры... Мастачка вольна карыстаецца акварэллю, зусім не клапаціцца аб яе празрыстасці ці чысціні, “зрывае” колер, драпае паперу. Адметным прыёмам творчага пошуку Ляховіч з’яўляецца акварэльнае змыванне: “Змыў тым добры, што яго не прыдумаеш. Нельга планаваць вынік” [7]. Мастачка не баіцца адкрытага ўльтрамарыну, ізумрудна зялёнай фарбы, нават флюарэсцэнтных. “Я люблю, як фарбы часам сваціліся, – адзначае В. Ляховіч. – Даволі часта спецыяльна не прыдумваю малюнак, а проста з захапленнем шукаю новую каларыстычную інтэрпрэтацыю ўжо некалі створанай кампазіцыі”[23]. Некаторыя яе творы сваёй манументальнасцю і фактурай “нагадваюць фрэскі. Гэтаму ў значнай ступені садзейнічаюць эксперыменты з адбіткамі фактур і складаныя манатыпіі” [10]. Шматлікія творы В. Ляховіч камбінуюць жывапіс і калаж, элементамі якога становяцца нават фотафрагменты твораў, што раней былі зроблены мастачкай.

**Аб’екты і праекты.** З’яўленне аб’ёмных форм у В. Ляховіч можна лічыць даволі арганічнай з’явай для яе творчасці. Мастачка свядома рухалася ад калажаў і асамбляжаў да прасторавых аб’ектаў, скульптуры. “Мне надакучылі плоскія карцінкі на сценах. Мне захацелася выйсці ў аб’ём і расфарбаваць яго”[24]. І разам з тым В. Ляховіч не адразу прыйшла да ўсяго таго, што глядач бачыць на яе выставах сёння. Сваю ролю ў гэтым адыгралі паездкі за мяжу, удзел у мастацкіх пленэрах, дыялогі з мастакамі, наведванне музеяў і выстаў сучаснага мастацтва.

Аб’екты В. Ляховіч уяўляюць сабой арганічны сінтэз канцэпцыі вобраза і складанага каларыстычна і пластычна вырашанага аб’ёма. Выкарыстанне ёю ў сваёй творчай практыцы элементаў “трэш-культуры” (смецця) ставіць перад мастачкай даволі спецыфічныя задачы, прымушае нават думаць інакш, чым гэта ўласціва творцам, якія працуюць з традыцыйнымі пластычнымі матэрыяламі. Для В. Ляховіч выкінутыя на сметнік рэчы – гэта “збор пакінутых, амаль жывых вобразаў”, “выдатны формаўтваральны матэрыял” [11, с. 106]. “Канешне ж, старыя рэчы, яны самі пра сябе апавядаюць. Там ёсць нейкая боская энергія”[25]. Як сапраўдны прадстаўнік постмадэрнізму, В. Ляховіч у сваіх творчых практыках скіравана не проста на эксперымент, а на стварэнне канцэптуальных аб’ектаў.

Разам з тым Валянціна Ляховіч падкрэслівае, што, працуючы над уласнымі аб’ектамі, праз прызму ўласнай фантазіі яна звяртае ўвагу на тое, каб твор у выніку быў падпарадкаваны класічным законам мастацтва: у архітэктоніцы, рытмічнай арганізацыі, сваім каларыстычным рашэнні. Безумоўна, многае ў творчасці мастачкі трымаецца на “інтуіцыі як метадзе бачання, своеасаблівым пазнанні, якое не патрабуе тлумачэнняў у рацыяльных і лагічных катэгорыях. Менавіта гэта і складае атмасферу загадкавасці і рамантычнасці” [10].

У адрозненне ад большасці твораў трэш-арта, або джанк-арта (“смеццевага мастацтва”), аб’екты В. Ляховіч пазбаўлены вычварнай эпатажнасці, скандальнасці, правакатыўнасці, пратэстнасці, ды і ўвогуле нейкіх намёкаў на тэму экалогіі і рацыянальнага выкарыстання рэсурсаў. Для В. Ляховіч смецце хутчэй зручны і даступны вобразны, формапластычны матэрыял. Гэта не азначае, што мастачка не разлічвае на навацыйнасць свайго творчага выказвання, магчыма нават яго парадаксальнасць, не імкнецца прыцягнуць увагу гледача да нейкай сацыяльнай тэмы ці праблемы, запрасіць да важнай дыскусіі.

Серыйнасць у творчасці прыводзіць В. Ляховіч да неабходнасці выкарыстання выставы-праекта як адзінага і цэласнага мастацкага выказвання. Значная роля пры гэтым належыць не толькі асобным творам, але і экспазіцыі ў цэлым. Большасць з праектаў В. Ляховіч злучана з яе уласнай біяграфіяй, так ці інакш закранае сюжэты з яе жыцця, успаміны пра родных і сяброў, разважанні... “Практычна ўсе мае творы адлюстроўваюць свет маіх пачуццяў, маю душу!”, – адзначае В. Ляховіч.

Звычайна над любым праектам мастачка працуе па некалькі месяцаў. Кожны праект Валянціны Ляховіч унікальны, падкрэслена аўтарскі, ствараецца для канкрэтнай экспазіцыйнай прасторы. “Я вырашаю экспазіцыю як карціну. Нічога выпадковага не павінна быць”[26]. Яшчэ на стадыі планавання праекта В. Ляховіч прадумвае экспазіцыю, шукае алгарытм выставачнай прасторы, месца для кожнага экспаната. У адных праектах яна драпіруе вокны папяровымі вітражамі, у іншых выкарыстоўвае штучнае святло, як дадатковы сродак выразнасці, размяшчае па ўсім перыметры выставачнай залы аб’екты, фотаздымкі... Для В. Ляховіч выстава – гэта своеасаблівы мастацкі трансформер, у якім яна з лёгкасцю нешта змяняе. Глядач на выставе нібыта акунаецца ўнутр канцэптуальна-вобразнага поля, якое створана

[23] Інтэрв’ю з В. Ляховіч. Запіс 2005 г. Архіў М. Цыбульскага.
[24] З успамінаў В. Ляховіч. Запіс перадачы “Время АРТ” ТРК “Віцебск” ад 02.05.2020.
[25] Інтэрв’ю з В. Ляховіч. Запіс 13.05.2025. Архіў М. Цыбульскага.
[26] З успамінаў В. Ляховіч. Запіс перадачы “Время АРТ” ТРК “Віцебск” ад 02.05.2020.

мастачкай, становіцца паўнавартасным сутворцам і актыўным удзельнікам "дыялога" з ёй.

Рэверсіўныя стратэгіі В. Ляховіч і яе падыходы да канвертацыі формы і прасторы добра вядомыя арганізатарам выстаў мастачкі. Асабліва выразна гэта праявілася ў экспазіцыі "Арт Прасторы" (Віцебск, вул. Талстога 7), якую майстар ператварыла па сутнасці ў эксперыментальную творчую лабараторыю.

Сярод шэрагу значных праектаў Валянціны Ляховіч варта прыгадаць "Стоўп-а-тварэнне бяссонных начэй" (2013, Магілёўскі абласны мастацкі музей імя П.В. Масленікава), "Радня" (2014, Віцебскі абласны краязнаўчы музей), "Кола жыцця" (2015, Віцебскі абласны краязнаўчы музей), "Жыццё колеру на паперы" (2015, Арт-цэнтр Марка Шагала), "Палімпсесты Валянціны Ляховіч" (2017, Полацкая мастацкая галерэя), "Зваротная сувязь" (2017, Віцебскі цэнтр сучаснага мастацтва), "Зацьменне" (2019, Мастацкая галерэя, Полацк), "Сіні тралейбус" (2020, Віцебскі мастацкі музей), "Аберацыі святла" (2020, Карцінная галерэя Г.Х. Вашчанкі, Гомель), "Залежнасць" (2021, Палац мастацтваў, Мінск), "Лучаскія экзерсісы" (2021, Арт-цэнтр Марка Шагала), "Стих и Я" (2021, Канцэртная зала "Віцебск"), "Трансфармацыя" (2024, Полацкая мастацкая галерэя).

Немагчыма нават пазначыць увесь дыяпазон тэм і вобразаў, да якіх В. Ляховіч звяртаецца ў сваёй творчасці, што становяцца асновай яе праектаў. Гэта і неабдымныя па сваім значэнні экзістэнцыяльныя тэмы, і звычайныя праблемы сучаснага жыцця, і тое, што захоўваецца ў лабірынтах памяці мастачкі. Аснову вобразаў нярэдка ствараюць вядомыя архетыпы, сімвалы, сакральныя вобразы, знакі і, разам з тым, вобразы сучаснікаў, прыродныя матывы, гарадскія краявіды. "Вельмі моцна на мяне ўплывае музыка, – падкрэслівае В. Ляховіч. – У жывым выкананні асабліва. Пры гэтым я люблю любую добрую музыку: і рок, і класіку"[27]. Увогуле класіка, асабліва ў мастацтве выяўленчым, для В. Ляховіч выдатны трыгер абуджэння аўтарскай вобразнасці. Мастачка "не толькі зберагла ў душы трапяткую ўдзячнасць класіцы, але і па сёння жыве яе рэмінісцэнцыямі" [7]. Невыпадкова на працягу розных перыядаў творчасці В. Ляховіч у назвах яе кампазіцый сустракаюцца імёны Феафана Грэка, Васіля Кандзінскага, Альбрэхта Дзюрара, Мікеланджала, Пабла Пікаса і іншых.

Агляд эвалюцыі творчасці мастачкі можна завяршыць словамі самой В. Ляховіч:"Мастак, як і ўсё мастацтва, не можа стаяць на месцы, ён павінен развівацца. Гэта доўгі працэс. Роля эксперыментаў на гэтым шляху вызначальная. Але і яны не гарантуюць поспеху. Дасягнуць вышыняў у мастацтве не проста"[28].

**Заключэнне.** Пра Валянціну Ляховіч у мастацкім асяроддзі рэспублікі здаецца ўжо даўно перасталі казаць як толькі пра выдатную і таленавітую акварэлістку. Мастачка ў апошняе дзесяцігоддзе зарэкамендавала сябе і як майстар манументальных, вялікіх па памерах жывапісных твораў, і як аўтар своеасаблівых і эфектных мастацкіх аб'ектаў. Але В. Ляховіч не проста вельмі адметная асоба ў беларускім мастацтве, яе творчасць выглядае вельмі годна і прэзентацыйна ў сусветным кантэксце, паколькі сапраўдны талент працуе ў актуальным полі сучаснага мастацтва.

Незадаволенасць аднойчы ўжо знойдзеным вядзе да таго, што Валянціна Ляховіч нярэдка звяртаецца да раней створаных работ, і ўносіць змены як у асобныя дэталі, так і цалкам перапрацоўвае твор. "Відавочна, выдумляць заўжды цяжка. Але ж для мяне гэта натуральны стан, мне проста патрэбна супраціўленне тэмы" [10]. Валянціна Ляховіч больш за ўсё імкнецца "не стаміцца думаць, рабіць нешта новае"[29]. А галоўнае – ёй хочацца тварыць. "Я атрымліваю задавальненне ад працы. Мне ўтульна ў маёй майстэрні. Тут мяне чакае тое, што я хачу зрабіць, тое, што люблю!"[30].

**ЛІТАРАТУРА**

1. Цыбульский, М.Л. Ляхович Валентина Антоновна / М.Л. Цыбульский // Регионы Беларуси: энцикл.: в 7 т. / редкол.: Т.В. Белова (гл. ред.) [и др.]. – Минск: Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2011. – Т. 2: Витебская область. Кн. 2. – С. 95.
2. О современном искусстве и о тех, кто его делает: Валентина Ляхович. – URL: https://artkurator.com/arts/Liahovich.html (дата звароту: 13.03.2025).
3. Ляхович, В. О себе / В. Ляхович // Валентина Ляхович. Каталог. – Витебск, 2001. – С. 1.
4. Ге, А.С. "Новая шчырасць" Валянціны Ляховіч / А.С. Ге // Искусство и культура. – 2019. – № 3. – С. 48–53.
5. Цыбульскі, М. Дзіватворы колеру / М. Цыбульскі // Беларусь. – 2001. – № 8. – С. 56.
6. Лазаренко, С. Валентина Ляхович / С. Лазаренко // Валентина Ляхович. Живопись. Графика. – Витебск, 1991. – С. 1.
7. Прускі, А. Магічны знак аддаленай рэальнасці / А. Прускі // Мастацтва. – 1997. – № 8. – С. 23–24.
8. Вакар, Л. Акварельный палимпсест Валентины Ляхович / Л. Вакар // Бюллетень Музея Марка Шагала. – Витебск, 2006. – Вып. 14. – С. 7–11.
9. Вакар, Л. Космос – Природа – Дом / Л. Вакар // Наше наследие. – 2010. – № 96. – С. 150–151.
10. Цыбульскі, М. Трыумф фантазіі, пачуццяў, інтуіцыі / М. Цыбульскі // Культура. – 2005. – 25 чэрв.–1 ліп. – С. 7.
11. Ляхович, В. Живопись. Инсталляции. Объекты [Изоматериал]: [альбом] / В. Ляхович; сост., авт. текста Е.С. Ге. – Минск: Медисонт, 2018. – 215 с.

*Паступіў у рэдакцыю 15.05.2025*

[27] Інтэрв'ю з В. Ляховіч. Запіс 11.05.2025. Архіў М. Цыбульскага.

[28] Інтэрв'ю з В. Ляховіч. Запіс 13.05.2025. Архіў М. Цыбульскага.
[29] З успамінаў В. Ляховіч. Запіс перадачы "Время АРТ" ТРК "Віцебск" ад 02.05.2020.
[30] Інтэрв'ю з В. Ляховіч. Запіс 13.05.2025. Архіў М. Цыбульскага.